**М.С. КІРЫЛЕНКА**
Рэспубліка Беларусь, Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава

# НАГЛЯДНАСЦЬ У КАНТЭКСЦЕ РАЗВІЦЦЯ МАЎЛЕННЯ НАВУЧЭНЦАЎ 1–4 КЛАСАЎ

Прынцып нагляднасці з′яўляецца прыярытэтным у навучанні малодшых школьнікаў. Нагляднасць павышае пазнавальную актыўнасць, робіць працэс спазнання свядомым, асэнсаваным, дапамагае бачыць і вылучаць галоўнае, канцэнтраваць увагу на засваенні новага матэрыялу, напаўняць яго, паводле К.Д.Ушынскага, “формамі, фарбамі, гукамі, адчуваннямі” [1, с. 410]. Па сцвярджэнні псіхолагаў, малодшыя школьнікі маюць невысокі ўзровень засяроджанасці, схільныя хутка пераключаць увагу. Менавіта з гэтай прычыны ім неабходна "бачыць", "чуць", "адчуваць", адпаведна настаўнік пачатковай школы вымушаны выкарыстоўваць у працэсе навучання наглядныя метады. Вобразны, наглядны фармат вучэбнай інфармацыі рэалізуецца з дапамогай розных сродкаў навучання – ілюстрацый, схем, відэаматэрыялаў, рэальных прадметаў. У гэтым выпадку навучанне будуецца на канкрэтных вобразах, якія непасрэдна ўспрымаюцца вучнямі.

**Асноўная частка.** Тэарэтычнае абгрунтаванне прынцыпу нагляднасці ў навучанні ўпершыню прапанаваў Ян Амос Коменскі (1592–1670 гады). Вялікі педагог лічыў нагляднасць залатым правілам навучання: "Нічога не можа сфарміравацца ў свядомасці, што загадзя не было дадзена ў адчуваннях" [2, с. 70]. У якасці нагляднасц, па меркаванні Я.А. Коменскага, неабходна выкарыстоўваць: 1) рэальныя прадметы і непасрэднае назіранне над імі; 2) мадэлі, копіі прадметаў; 3) малюнкі з выявамі прадмета або з'явы. Абгрунтоўваючы прынцып нагляднасці ў працы "Вялікая дыдактыка", Я.А. Коменскі сфармуляваў “залатое правіла” педагогікі: “Усё, што толькі можна, трэба падаваць для ўспрымання пачуццямі: тое, што бачыцца, – для ўспрымання зрокам, што чуецца, – слыхам, пахі – нюхам, што можна паспрабаваць, – смакам, даступнае дотыку – шляхам дотыку. Калі якія-небудзь прадметы адразу можна ўспрыняць некалькімі пачуццямі, няхай яны адразу схопліваюцца некалькімі пачуццямі” [2, с. 302–303].

Ролю нагляднасці ў развіцці маўлення падкрэсліваў вядомы педагог К.Д. Ушынскі. Ён пісаў: «Вучыце дзіця якім-небудзь пяці невядомым яму словам, і яно будзе доўга і дарэмна мучыцца з імі; але звяжыце з малюнкамі па дваццаць такіх слоў – і дзіця засвоіць іх імгненна» [1, с. 267]. Ролю нагляднасці ў навучанні малодшых школьнікаў акцэнтавала Н.К. Крупская: “Неабходна выхоўваць культуру ўспрымання ў дзяцей, вучыць гаварыць жывой, вобразнай мовай. Варта найперш навучыць іх назіраць. Калі прапанаваць дзіцяці апісаць лес, раку, вуліцу, якія ён бачыць, дзіця не здолее вылучыць істотнае, тыповае. А вось малюнкі могуць дапамагчы навучыць дзіця бачыць, разглядваць» [3, с. 86].

Навуковая спадчына Н.К. Крупскай, Я.А. Коменскага, К.Д. Ушынскага і іншых вучоных раскрывае каштоўнасць педагагічных поглядаў для сённяшняй навукі і практыкі. Працы даследчыкаў аказваюць плённы ўплыў на сучасную методыку, якая выкарыстоўвае класічныя напрацоўкі для развіцця актуальных напрамкаў прымянення нагляднасці, яе ролі ў развіцці маўлення навучэнцаў пачатковай школы. Безумоўна, ідэі папярэднікаў, якія горача абаранялі прынцып нагляднасці, знайшлі развіццё ў наш час. Нагляднасць ужо не суадносіцца толькі з этымалогіяй слова "глядзець", рамкі паняцця не абмяжоўваюцца зрокавым успрыманнем. У сучаснай дыдактыцы адбыўся паэтапны пераход да нагляднай мадэлі светаўспрымання. Каб павысіць якасць выкладання, неабходна максімальна задзейнічаць усе органы пачуццяў малодшага школьніка. Сёння сфармуляваны прынцып кагнітыўнай візуалізацыі як спосаб навучання і развіцця пазнавальных інтарэсаў навучэнцаў (А.А. Гулецкая, Т.А. Сырына, З.І. Трубіна). Гэты прынцып азначае не проста выкарыстанне "ілюстрацыі прадмета навучання, але і наступнае яе пераўтварэнне, пераасэнсаванне" [4, с. 81].

Навучэнцы пачатковых класаў адчуваюць цяжкасці пры падрыхтоўцы разгорнутых выказванняў. Недастатковая сфарміраванасць звязнага маўлення выяўляецца як у дыялогах, так і ў маналогах. У апавяданнях дзеці ў асноўным выкарыстоўваюць кароткія неінфарматыўныя фразы. Каб "разгаварыць" дзяцей, абудзіць у іх жаданне сказаць "сваё слова", варта выкарыстоўваць малюнкі. Напрыклад, В.Г. Бялінскі лічыў, што малюнак як форма пазнання рэчаіснасці дапамагае развіццю памяці, розуму і фантазіі дзіцяці. Ён з дзіўнай педагагічнай назіральнасцю

падкрэсліваў: «Паглядзіце, наколькі дзеці “жывуць” малюнкамі. Яны гатовыя прачытаць самы сухі і сумны тэкст, толькі б ён растлумачыў ім змест малюнка. З гэтай прычыны малюнкі ўсё больш і больш робяцца памочнікамі пры выхаванні і навучанні” [5, с. 94].

Наглядныя сродкі могуць прымяняцца на любым этапе ўрока. На пачатковым этапе пры знаёмстве з новай тэмай або тэкстам выкарыстоўваюцца візуальныя матэрыялы, якія выклікаюць цікавасць вучняў і актывізуюць іх маўленчую дзейнасць. Нагляднасць дапамагае навучэнцам уявіць сітуацыю, выкарыстоўваць актыўную лексіку, спрыяе запамінанню новых слоў і выразаў. На ўроках літаратурнага чытання візуалізацыя служыць важным інструментам для актывізацыі маўлення. Напрыклад, выкарыстанне картак з выявамі галоўных персанажаў або разгортванні сюжэта твора дапаможа звязна, паслядоўна расказаць пра падзеі, перадаць пачуцці і ўражанні.

Па-ранейшаму актуальным з′яўляецца выкарыстанне малюнкаў на ўроках мовы, якія ў сучасных умовах выконваюць стымулюючую функцыю для развіцця маўлення. Іх сістэматычнае прымяненне ўзбагачае слоўнік навучэнцаў і фарміруе здольнасць адбіраць словы, што адпавядаюць тэме і задуме выказвання. Малюнак актуалізуе пошук найбольш дакладных моўных сродкаў. Дыдактычная роля малюнкаў заключаецца ў стварэнні сітуацыі непасрэднага маўлення, якая заахвочвае падзяліцца думкамі, уражаннямі, эмоцыямі і фарміруе выразнасць вуснага выказвання. Сродкі нагляднасці ў гэтым выпадку выхоўваюць культуру маўлення, дапамагаюць запамінаць і ўжываць словы, словазлучэнні, прывучаюць захоўваць нормы літаратурнага вымаўлення.

Малюнак можа выконваць наступныя функцыі: раскрываць, каментаваць значэнне слоў, фразеалагічных зваротаў і стымуляваць ужыванне пэўнай лексікі. Малюнкі развіваюць творчыя ўменні навучэнцаў, спрыяюць маўленню. Малюнкі (фотаздымкі) пэўных прадметаў і пытанні да іх абуджаюць фантазію дзяцей, напрыклад:

– перад вамі – прыгожы букет кветак. Каму вы захочаце яго падарыць? Якія ласкавыя словы вы пры гэтым скажаце?

– Перад вамі – малюнкі кілім-самалёта і падаючай зоркі. Па якіх мясцінах нашай Радзімы вы адправіцеся ў падарожжа? Якія жаданні вы захочаце загадаць пры знікаючай зорцы?

– Перад вамі – сучасны смартфон і відэакамера. Якія моманты жыцця вы захочаце сфатаграваць? Якія подпісы будуць суправаджаць вашы здымкі?

– З кім вы хацелі б пагаварыць зараз па мабільным / дамашнім тэлефоне, па скайпу? Якія добрыя словы вы скажаце сваім субяседнікам?

Матэрыялам для ўласных малюнкаў і тлумачэнняў да іх могуць паслужыць вершы, аб'яднаныя тэмай "На каго/на што падобная літара?". Вучань можа выбраць сваю любімую літару (патлумачыўшы свой выбар) і падрыхтаваць каментарый да малюнка. Матэрыялам могуць выступаць творы, прысвечаныя вобразу той ці іншай літары, напрыклад:

– літара **Д**: Д стаіць як новы дом. На дзвюх нагах трымае ён сцены, крышу, усю падлогу. Памажыце яму троху!;

– літара **Л**: Л падобна на будан, добра змайстраваны. Трэба нам такі зрабіць, каб хоць крышку адпачыць;

– літара **Ш**: Ш шырокая, з зубамі, і стаяць яны радком. Палічыце іх, сябры, – зубоў будзе толькі тры.

Апавяданне па малюнку дапамагае дэталёва разгледзець і зразумець пэўную падзею, уявіць абставіны, у якіх яна адбываецца. Складанне вусных апавяданняў спрыяе развіццю вобразнага мыслення і вобразнага маўлення. Пры «перакладзе» зместу карцінкі ў слоўнае апісанне навучэнцы імкнуцца знайсці патрэбныя словы, дакладныя і эмацыйныя выразы. Нагляднасць пры гэтым з'яўляецца ўмовай развіцця слоўнікавага запасу праз фарміраванне ўменняў бачыць, назіраць. Навык заўважаць дэталі, форму, колер, асаблівасці малюнка выпрацоўваецца ў працэсе сістэматычнай слоўнікавай працы.

Сюжэтны характар нагляднага матэрыялу адпавядае інтэлектуальным і ўзроставым магчымасцям навучэнцаў пачатковых класаў. Каб навучыць дзяцей захоўваць часавую і лагічную паслядоўнасць, можна выкарыстоўваць серыйныя малюнкі. У гэтым выпадку дзіцяці трэба стварыць апавяданне, абапіраючыся на малюнкі, – своеасаблівы план пераказу. Калі вучань навучыцца свабодна расказваць, можна прапанаваць самастойна размясціць у патрэбнай паслядоўнасці 3–4 малюнкі і скласці апавяданне на іх аснове. Гэта дапамагае актуалізаваць зносіны ў выглядзе сюжэтна-ролевай гульні, у якой вучню адводзіцца роля актыўнага ўдзельніка, раўнапраўнага партнёра па маўленні.

Сярод комплексу сучасных сродкаў нагляднасці – малюнкі, фатаграфіі, табліцы, схемы, графікі, дыяграмы, інтэлект-карты, дапоўненая рэальнасць – вылучым калаж як наклейванне на пэўную аснову матэрыялаў рознай фактуры і розных колераў. Так, пры падрыхтоўцы калажа "Люблю Беларусь" можна вылучыць некалькі блокаў-зон, якія адлюстроўваюць розныя аспекты: гарады Беларусі, гісторыя краіны, сённяшні дзень, мастацтва, адукацыя і г.д. Асновай калажа могуць стаць фатаграфіі беларускіх пісьменнікаў, акцёраў, кампазітараў, рэпрадукцыі карцін, выявы помнікаў і інш. Важна не толькі стварыць прыгожы калаж, але і «агучыць» яго кароткімі паведамленнямі, апавяданнямі пра родную краіну, пра тых, хто праслаўляе яе сваімі подзвігамі і самаадданай мірнай працай. Радасна было слухаць адказы вучняў на пытанне: Чаму ты ганарышся сваёй Радзімай? Замілавана гучалі падрыхтаваныя дзецьмі вершы на роднай мове:

Зямля мая завецца Беларуссю,
Сваёй зямлёй я вельмі ганаруся.
Прырода ў маім краі прыгажосцю
Падзівіць самага цікаўнейшага госця (А. Куляшоў).

*

Зямля мая далёкая,
Зямля мая цудоўная,
Радзіма сінявокая,
Каму красой ты роўная?
Мо ёсць і прыгажэйшая
– Каму што ў сэрцы глянецца –
Мая ж найдарэжэйшаю
На ўсё жыццё застанецца (П. Панчанка).

Стварэнне калажа вырашае не толькі адукацыйныя (яны ўтрымліваюць цікавыя факты, развіваюць паняцце кампазіцыі ў размяшчэнні інфармацыі, удасканальваюць уменні рыхтаваць паведамленні па тэме, працаваць у камандзе), але і выхаваўчыя задачы: развіваюць акуратнасць, адказнасць пры падрыхтоўцы матэрыялаў. Пры гэтым усведамляецца прыналежнасць да сваёй зямлі, умацоўваецца гонар за родную краіну, яе набыткі і дасягненні.

На ўроках мовы – услед за падручнікам – павінна рацыянальна выкарыстоўвацца графічная нагляднасць праз чытанне, аналіз і запаўненне табліц з апорай на лінгвістычныя правілы, асэнсавана прымяняцца схемы на ўсіх этапах працы над паняццем, супастаўляцца тэкставы і таблічны матэрыял, што забяспечвае матывацыю засваення тэарэтычных ведаў. Як лічаць даследчыкі, сістэма заданняў на аснове графічнай нагляднасці павінна быць скіравана на “перакадзіраванне інфармацыі, запамінанне граматычных паняццяў і развіццё разумовых аперацый” [6, с. 37].

**Заключэнне.** Такім чынам, выкарыстанне нагляднасці на ўроках развіцця маўлення ўзмацняе педагагічны эфект: выхоўваецца назіральнасць, увага да дэталяў, развіваецца дар слова, стымулююцца творчыя здольнасці навучэнцаў, фарміруецца цікавасць да мовы, жаданне авалодаць яе багаццямі. Сродкі нагляднасці маюць вялікія магчымасці для развіцця маўлення, іх прымяненне ўдасканальвае навыкі падрыхтоўкі вусных і пісьмовых выказванняў.

Ужыванне нагляднасці сведчыць: добра вучыць мове азначае не толькі фарміраваць асновы моўнай кампетэнцыі, але і развіваць маўленчыя здольнасці, аптымізаваць пазнавальную дзейнасць малодшых школьнікаў, забяспечваць адзінства канкрэтна-вобразнага і абстрактнага мыслення навучэнцаў.

У кантэксце актуальнасці праблемы развіцця маўлення сучасна гучыць запавет аўтара першага дапаможніка па методыцы выкладання мовы Якуба Коласа: “Умелае актыўнае карыстанне роднаю моваю для выказвання ўласных думак, перажыванняў вучня – канчатковая мэта навучання роднай мове” [7, с. 319].

Спіс цытаваных крыніц:

1. Ушинский, К.Д. Родное слово: книга для детей и родителей / К.Д. Ушинский. – М.: Лествица, 2000. – 494 с.

2. Коменский, Я.А. Сочинения / Я.А. Коменский: отв. ред. и сост. А.Л. Субботин. – М.: Наука, 1997. – 476 с.

3. Крупская, Н.К. Дети – наше будущее / Н.К. Крупская. – М.: Просвещение, 1975. – 302 с.

4. Сырина, Т.А. Когнитивная визуализация: сущность понятия и его роль в обучении языку / Т.А. Сырина // Вестник ТГПУ. – 2016. – № 7. – С. 81–85.

5. Белинский, В.Г. Избранные статьи / В.Г. Белинский. – М.: Детская литература, 1970. – 192 с.

6. Гогун, Е.А. Графическая наглядность на уроках русского языка как средство развития младшего школьника / Е.А. Гогун // Начальная школа. – 2024. – № 1. – С. 34–38.

7. Міцкевіч, К.М. Методыка роднае мовы / К. М. Міцкевіч // Колас, Я. Збор твораў: у 12 т. – Т. 12. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1976. – С. 298–329.

**Я.А. КОВАЛЬ**
Рэспубліка Беларусь, Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава

# РОЛЯ ЎЗБАГАЧЭННЯ СЛОЎНІКАВАГА ЗАПАСУ Ў РАЗВІЦЦІ МАЎЛЕННЯ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

Як вядома, адну з галоўных роляў у фарміраванні асобы чалавека іграе соцыум. Грамадства, якое акружае чалавека, у значнай ступені ўплывае нават на тое, на якой мове будзе размаўляць чалавек. Калі дзіця будзе чуць беларускае маўленне толькі на ўроках у школе, яно наўрад ці загаворыць на роднай мове. Больш за тое, яно не будзе лічыць беларускую мову запатрабаванай. Калі ж у асяроддзі дзіцяці ёсць тыя, хто размаўляе на беларускай мове, гэта павышае цікавасць вучня да адной з самых прыгожых і меладычных моў свету – беларускай. З гэтай прычыны надзвычай важна праводзіць работу па развіцці маўлення і ўзбагачэнні актыўнага беларускага слоўнікавага запасу школьніка не толькі ва ўстановах адукацыі, але і ў акружэнні маленькай асобы. *Мэта артыкула* – прааналізаваць метадычныя шляхі, паводле якіх узбагачаецца і актывізуецца слоўнікавы запас у кантэксце развіцця маўлення малодшых школьнікаў.

**Асноўная частка.** Як вядома, прыярытэтам сучаснай пачатковай адукацыі з’яўляецца “фарміраванне агульнавучэбных уменняў і навыкаў, узровень засваення якіх у значнай ступені прадвызначае паспяховасць адукацыі навучэнца, развіццё яго асобасных якасцей і захаванне індывідуальнасці” [1, с. 14]. У кантэксце вылучаных задач адной з найважнейшых выступае развіццё маўлення як асноўная ідэя школьнага навучання. Паводле пазіцыі метадыста В.У. Протчанкі, пад развіццём маўлення разумеецца “арганізацыя аналітыка-сінтэтычнай моўнай і практычнай маўленчай дзейнасці, якая садзейнічае мэтанакіраванаму развіццю інтэлекту і маўленчых механізмаў, выпрацоўцы нормаў літаратурнага вымаўлення і правапісу, стымулюе ўзбагачэнне слоўніка і граматычнага ладу мовы вучняў” [2, с. 84]. Ад вырашэння сфармуляванай задачы залежыць інтэлектуальнае і агульнае развіццё дзяцей, іх далейшыя поспехі ў жыцці.

Развіццё маўлення ў шырокім сэнсе – гэта працэс, накіраваны на забеспячэнне практычнага авалодання навучэнцамі мовай, якая выконвае сваю асноўную, камунікатыўную, функцыю ў дзвюх формах: вуснай і пісьмовай. Развіццё маўлення – гэта фарміраванне навыкаў вымаўлення; узбагачэнне і актывізацыя слоўнікавага запасу навучэнцаў; развіццё стылістычных і сінтаксічных навыкаў; паляпшэнне камунікатыўных маўленчых уменняў.

Пры правядзенні даследавання выкарыстаны як *тэарэтычныя*, так і *эмпірычныя* метады. У якасці асноўнага метаду быў абраны аналіз базавых паняццяў і навукова-педагагічнай літаратуры па тэме, абагульненне тэарэтычнага і эмпірычнага матэрыялу, а таксама параўнанне зместу вучэбных праграм і школьных падручнікаў па беларускай мове для 1–4 класаў. Пры аналізе паняццяў *слоўнікавы запас, развіццё маўлення* вучняў выкарыстаны даследаванні айчынных і расійскіх вучоных (А.А. Айвазян, Г.М. Валочка, Л.С. Васюковіч, В.У. Зелянко, Л.П. Падгайскі, В.У. Протчанка, В.Ф. Русецкі, А.А.Смірнова, А. П. Шанько, М.Г. Яленскі і інш.).

Важным паказчыкам сфарміраванасці інтэлектуальных і маўленчых здольнасцей школьнікаў выступае багацце іх слоўнікавага запасу, які служыць неабходным будаўнічым матэрыялам для выказванняў. Мысленне і маўленне чалавека фарміруюцца і развіваюцца з ранняга дзяцінства ў актыўнай практычнай дзейнасці. У пачатковай школе важная роля належыць рабоце па ўзбагачэнні слоўніка малодшых школьнікаў з мэтай фарміравання і актывізацыі іх маўленчай і разумовай дзейнасці.

Часта малодшыя школьнікі, для якіх зусім нядаўна асноўным відам дзейнасці была гульнёвая дзейнасць, саромеюцца свайго маўлення пры зносінах, неахвотна ўдзельнічаюць